ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ**

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ И ПО ДЕЛАМ МОЛОДЁЖИ**

**ЗАГАД** — **ПРИКАЗ**

03.02.2021 № 15

г. Гомель

Аб правядзенні абласнога
конкурсу вакальных ансамбляў
з найменнем "народны (узорны)
аматарскі калектыў"
"Поющая Гомельщина", прысвечанага
80-годдзю з дня нараджэння народнага
артыста СССР Мулявіна У.Г.

У мэтах павышэння сацыяльнай ролі аматарскай творчасці і ідэйна-мастацкага ўзроўню пеўчых калектываў, узбагачэння рэпертуару лепшымі творамі беларускага пеўчага мастацтва і апрацоўкамі рэгіянальнага песеннага матэрыялу, стварэння спрыяльных умоў для развіцця творчай дзейнасці аматарскіх калектываў

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці ў дыстанцыйным фармаце абласны конкурс вакальных ансамбляў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" "Поющая Гомельщина", прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР Мулявіна У.Г. (далей – абласны конкурс) у кастрычніку 2021 года.

2. Зацвердзіць палажэнне, умовы і склад арганізацыйнага камітэта абласнога конкурсу (дадаткі 1, 2, 3).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога конкурсу ўскласці на ўстанову "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" (Сафрановіч Н.Д).

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021-2025 гг., а таксама ўступных узносаў.

5. Начальнікам аддзелаў (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў, Гомельскага гарвыканкама

0007676

Зак. 1400-2000

аказаць садзейнічанне ў арганізацыйным забяспячэнні ўдзелу калектываў у абласным конкурсе.

6. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгароднюю І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Д.У.Езерскі

Волкава 33 46 75

Дадатак 1
да загада начальніка галоўнага
ўпраўлення ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Гомельскага абласнога выканаўчага
камітэта
ад ____________2021г. №___

**Палажэнне**
аб правядзенні абласнога дыстанцыйнага конкурсу вакальных ансамбляў
з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў"
"Поющая Гомельщина", прысвечанага 80-годдзю з дня нараджэння
народнага артыста СССР Мулявіна У.Г.

**Мэты абласнога конкурсу.**

Абласны конкурс вакальных ансамбляў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" (далей – абласны конкурс) праводзіцца ў мэтах павышэння сацыяльнай ролі аматарскай творчасці і ідэйна-мастацкага ўзроўню пеўчых калектываў, узбагачэння рэпертуару лепшымі творамі беларускага пеўчага мастацтва і апрацоўкамі рэгіянальнага песеннага матэрыялу, стварэння спрыяльных умоў для развіцця творчай дзейнасці аматарскіх калектываў.

**Кіраўніцтва абласным конкурсам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога конкурсу ствараецца абласны аргкамітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, ДУ "Гомельскі абласны цэнтр па забеспячэнню дзейнасці бюджэтных арганізацый у сферы культуры" і ўстановы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці".

У перыяд падрыхтоўкі абласнога конкурсу аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу абласнога конкурсу, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным конкурсам у тэрмін правядзення мерапрыемства, уводзіць дадатковыя намінацыі.

Абласны конкурс вакальных ансамбляў праводзіцца дыстанцыйна з уступным узносам.

Заяўкі на ўдзел у абласным конкурсе і творчыя характарыстыкі ўдзельнікаў (разам з фотаздымкам у фармаце tiff, або jpeg, або jpg не менш 800x600 пікселяў і відэа з выступам), скан ці фота квітанцыі аб аплаце ўступнага ўзносу дасылаюцца да 10 верасня 2021 года на электронны адрас: (ocnt7@mail.gomel.by) установа "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці (форма заяўкі дадаецца).

На афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на працягу 5 дзён, пасля апошняга дня прыняцця заявак, будзе размешчаны спіс удзельнікаў абласнога конкурсу.

**Падвядзенне вынікаў абласнога конкурсу і ўзнагароджанне.**

Журы будзе ўлічваць:

- выкананне ўмоў конкурсу;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- сцэнічную культуру;
- раскрыццё музычна-вобразнага зместу твораў;
- падбор конкурснай праграмы;
- касцюміраванне.

Па выніках конкурсных выступленняў журы абласнога конкурсу вызначае лаўрэата з уручэннем Гран-пры, дыплома і каштоўнага падарунка на суму ў памеры да 8 базавых велічынь.

Калектывы, якія прадэманструюць высокае выканаўчае майстэрства, конкурсную праграму, якая раскрывае творчы патэнцыял калектыву і сцэнічную культуру, будуць узнагароджаны дыпломамі I, II, III ступеняў і каштоўнымі падарункамі:

I ступені – на суму ў памеры да 6 базавых велічынь;
II ступені – на суму ў памеры да 5 базавых велічынь;
III ступені – на суму ў памеры да 3 базавых велічынь.

Аргкамітэт абласнога конкурсу прадугледжвае дадатковае ўзнагароджанне дыпломамі і каштоўнымі падарункамі на суму ў памеры да 2 базавых велічынь у намінацыях:

- за захаванне рэгіянальных традыцый;
- за лепшае выкананне апрацоўкі беларускай народнай песні a cappella;
- за лепшае раскрыццё музычна-вобразнага зместу твораў;
- за крэатыўны падыход да выканання конкурснай праграмы.

Астатнія калектывы ўзнагароджваюцца граматамі за ўдзел у абласным конкурсе.

Па выніках абласнога конкурсу выдаецца буклет.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі або ўвесці новыя. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Прагляд конкурсных работ будзе ажыццяўляцца членамі журы ў кастрычніку, узнагароджанне - у лістападзе.

Лепшыя выступленні калектываў будуць размешчаны на афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” і YouTube канале https://www.youtube.com/channel/UCM1VyhbWr1NfLumiemWwF5Q пасля падвядзення вынікаў.

**Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021-2025 г.г і ўступных узносаў.

Для ўдзелу ў абласным конкурсе калектывам неабходна аплаціць уступны ўзнос.

Уступны ўзнос складае 1,5 базавыя велічыні (не ўлічваючы камісіі банка). Ён уключае ў сябе выдаткі па арганізацыі і правядзенні конкурсу: набыццё каштоўных прызоў і сувенірнай прадукцыі. За кошт сродкаў абласнога бюджэту ажыццяўляецца падрыхтоўка дыпломаў і грамат, аплата працы журы.

Рэквізіты для пералічэння ўступнага ўзносу:

Арганізатар/атрымальнік плацяжу: установа “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”. Адрас: г.Гомель вул.Кірава 49, 246022.

Разліковы рахунак: BY12 AKBB 3632 0401 0009 3300 0000 у Гомельскім філіяле №300 АСБ “Беларусбанк”

БІК AKBBBY21300

УНН 400002570

ОКПО 55610183000

Аплата ўступнага ўзносу за ўдзел у конкурсе павінна быць з абавязковым указаннем назвы конкурсу, прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка, назвай калектыву.

У выпадку адмовы ўдзельніка ад удзелу ў конкурсе (у тым ліку па ўважлівай прычыне) уступны ўзнос не вяртаецца.

Кантактны нумар +375299379309, (0232) 337109

Кандрацьева Валерыя Канстанцінаўна.

Дадатак 2
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 2021 г. №

**Умовы**
правядзення абласнога дыстанцыйнага конкурсу вакальных ансамбляў з найменнем “народны (узорны) аматарскі калектыў” “Поющая Гомельщина”, прысвечанага 80-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР Мулявіна У.Г.

**Умовы правядзення.**

Абласны конкурс праводзіцца ў кастрычніку 2021 года.

У абласным конкурсе прымаюць удзел вакальныя ансамблі з найменнем “народны (узорны) аматарскі калектыў” незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

**Конкурсныя выступленні праводзяцца па наступных намінацыях:**

- вакальныя ансамблі з акадэмічнай манерай выканання;
- вакальныя ансамблі з народнай манерай выканання;
- вакальныя ансамблі з эстраднай манерай выканання;
- дзіцячыя вакальныя ансамблі.

**Патрабаванні да праграмы.**

Конкурсная праграма складаецца з двух твораў агульнай працягласцю да 7 хвілін, якія выконваюцца запар. Тэматыка праграмы павінна адпавядаць узроставым асаблівасцям і вакальнай падрыхтоўцы ўдзельнікаў калектыву.

**Выкарыстанне мінус фанаграм з бэк-вакалам не дазваляецца!**

**Дазваляецца выконваць:**

1. Калектывам з акадэмічнай манерай выканання:
- твор a cappella;
- твор па выбару.

2. Калектывам з народнай манерай выканання:
- беларускую народную песню альбо яе апрацоўку a cappella;
- твор па выбару.

3. Калектывам з эстраднай манерай выканання:
- твор сучаснага беларускага аўтара (аранжыроўшчыка);
- твор па выбару.

4. Дзіцячым калектывам:

- беларускую народную песню;
- твор па выбару.

**Конкурсная праграма калектыву павінна быць выкладзенная ў YouTube, спасылку на выступ трэба ўказаць ў заяўцы.**

Відэазапіс не павінен змяшчаць мантажу або спецэфектаў, запіс павінен быць выкананы са штатыва у высокай якасці без акустычных правалаў. Павінны адсутнічаць шумавыя гукі. Відэа можа быць знята на прафесійнае абсталяванне або мабільны тэлефон ва ўмовах рэпетыцыйнай залы (сцэны). Абавязковай умовай для адпраўленых матэрыялаў з'яўляецца выразнасць малюнка і гуку.

Для ўдзелу ў конкурсе калектывам неабходна аплаціць уступны ўзнос.

Кантактны нумар +375299379309 (0232) 337109

Кандрацьева Валерыя Канстанцінаўна.

Дадатак 3
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад                          2021 г. №

Склад арганізацыйнага камітэта
абласнога дыстанцыйнага конкурсу вакальных ансамбляў
з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў"
"Поющая Гомельщина", прысвечанага 80-годдзю з дня нараджэння
народнага артыста СССР Мулявіна У.Г.

| | |
|---|---|
| Езерскі Дзяніс Уладзіміравіч | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта |
| Сафрановіч Наталля Дзмітрыеўна | дырэктар установы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" |
| Чумакоў Дзмітрый Аляксеевіч | начальнік ДУ "Гомельскі абласны цэнтр па забеспячэнню дзейнасці бюджэтных арганізацый у сферы культуры" |

ЗАЯЎКА
ўдзельніка дыстанцыйнага абласнога конкурсу вакальных ансамбляў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" "Поющая Гомельщина", прысвечанага 80-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР Мулявіна У.Г.
________________________(раён, горад)

1. Поўная назва калектыву, базавая прыналежнасць
2. Прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка, кантактны тэлефон
3. Намінацыя
4. Колькасць удзельнікаў
5. Творчая характарыстыка, не больш 1 старонкі, фота калектыву
6. Скан ці фота квітанцыі аб аплаце ўступнага ўзносу
7. Рэпертуар і спасылка праграмы на YouTube:

| Аўтары твора | Назва твора | Хранаметраж | Носьбіт фанаграмы, акампаніруючая група | Прозвішча, імя і імя па бацьку саліста пры наяўнасці |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

| Спасылка праграмы на YouTube | |
|---|---|
| | |

Начальнік аддзела (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, Гомельскага гарвыканкама

________ (подпіс) ________ (ініцыялы, прозвішча)